рыжскай камуны. А. Банольдзі меў званне капітана ў рэвалюцыйным войску і стаў непахісным героем Парыжскай камуны. У адным з баёў ён быў цяжка паранены, але нават будучы не ў стане трымаць зброю ў руках, ён працягваў спяваць песні С. Манюшкі і тым самым натхняў камунараў. У. Мархель вельмі трапна перадаў пачуцці змагара за шчасце ўсяго чалавецтва ў апошнія хвіліны жыцця: ён «памёр, граючы на ліры» [4, с. 32]. Свой рэдкі музычны талент А. Банольдзі ахвяраваў змаганню «За вольнасць нашу і вашу!».

Жыццё і творчасць Джузэпэ (Ахілеса) Банольдзі яшчэ раз пацвярджаюць думку, што эпоха Рамантызму спарадзіла высокую духоўнасць, несла з сабой ідэі вызвалення і чалавечнасці. «Дух», «свабода», «асоба» былі ў той час намінальнымі паняццямі. Духоўнасць прарывалася ў сацыяльнае жыццё, і ўсё лепшае ў ім вынікала з гэтай крыніцы. Парыў боскай духоўнасці, што пераўтварае чалавека, у соцыуме рэалізаваўся ў высокамаральных пачуццях і гераічных учынках прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні, такіх як Банольдзі, якому Беларусь стала мілай Айчынай.

## Літаратура

1. Бортнік, І. А. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі: вучэб.-метад. дапам. / І. А. Бортнік. – Наваполацк: ПДУ, 2010. – 118 с.

2. Жылко, У. А. Рэалістычная парадыгма сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства другой паловы XIX – пач. XX ст. / У. А. Жылко // Белорусская национальная культура и личность: сб. материалов XXXVIII Итоговой науч. конф. студентов, магистрантов, аспирантов, 19 апр. 2013 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2013. – С. 307–313.

3. Лотман, Ю. М. Беседы о русской культуре / Ю. М. Лотман. – СПб.: Искусство, 1994. – 758 с.

4. Мархель, У. Крыніцы памяці / У. Мархель. – Мінск: Мастац. літ., 1990. – 222 с.

5. Раманюк, М. Саюз промня і чалавечага генію / М. Раманюк // Мастацтва. – 1992. – № 3. – С. 26–33.

6. Скарабагатаў, В. Зайгралі спадчынныя куранты / В. Скарабагатаў. – Мінск: Тэхналогія, 1998. – 154 с.

7. Сорокин, П. А. Социальная и культурная динамика / П. А. Сорокин. – М.: Астрель, 2006. – 1176 с.

8. Moniuszko, S. Listy zebrane / S. Moniuszko. – Krakow, 1969. – 376 s.

**Т. Ф. Сухоцкая** *(Мінск, Беларусь)*

# ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА МІХАЛА ЭЛЬВІРЫ АНДРЫЁЛІ Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Пераадоленне крызіснага стану сучаснай цывілізацыі магчыма толькі агульнымі намаганнямі сусветнай супольнасці. У пошуку шляхоў выйсця, прагназавання сумеснага будучага развіцця сёння неабходна паўнавартаснае выкарыстанне інтэграцыйнага патэнцыялу культуры. Навуковае асэнсаванне беларуска-італьянскага ўзаемадзеяння паспрыяе выпрацоўцы эфектыўных шляхоў удасканальвання міждзяржаўнага супрацоўніцтва, збліжэнню двух народаў.

Айчынныя даследчыкі адзначаюць глыбокае ўздзеянне італьянскай культуры на развіццё беларускага тэатра, балета, архітэктуры, выяўленчага мастацтва і г. д. Сістэмнае вывучэнне кантактавання дзвюх традыцый задае інтэнцыю крышталізацыі агульных сэнсаў беларускай і італьянскай культурнай прасторы.

Беларусь і Італія цесна перапляліся ў лёсе яркай і неардынарнай асобы мастака Міхала Эльвіры Андрыёлі. Яго бацька, Францішак Андрыёлі, быў італьянец па крыві, ураджэнец Ціроля. У 1812 г. удзельнічаў у паходзе арміі Напалеона на Расію і даслужыўся да чына капітана. За мужнасць атрымаў вышэйшую ўзнагароду Францыі – ордэн Ганаровага легіёна, але ў 1812 годзе трапляе ў палон. Пасля вызвалення пасяляецца ў Вільні. Працуе краўцом. Маючы здольнасці да мастацтва, імкнецца развіваць свой талент. Урокі скульптуры і разьбы ў прафесара архітэктуры Віленскага ўніверсітэта Караля Падчашынскага дапамаглі атрымаць пасведчанне мастака-дэкаратара, а пасля за выдатныя алейныя палотны ў 1839 г. – дыплом мастака і настаўніка малявання Імператарскай мастацкай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу.

У 1827 г. Францішак Андрыёлі атрымаў расійскае грамадзянства і ажаніўся з Петранелай Гаснеўскай, чый шляхецкі род падтрымліваў у вайне Напалеона.

Вось у такой шматнацыянальнай сям'і 2 (14) лістапада 1836 г. у Вільні нарадзіўся Міхал Эльвіра Андрыёлі. Асоба будучага мастака фарміравалася ў творчым асяроддзі пад уплывам італьянскай і беларускай культурных парадыгм. Мастацкая творчасць бацькі, знаёмства з працамі выдатных італьянскіх мастакоў праз кнігі, што знаходзіліся ў хатняй бібліятэцы, не толькі пашыралі кругагляд, але і выклікалі зацікаўленасць да малявання, развівалі пачуццё густу, прыгажосці, фарміравалі гуманістычны светапогляд.

Дзякуючы роду маці Міхал з самага дзяцінства выхоўваўся ў ліцвінскім духу, які базіраваўся на рыцарскіх традыцыях: нераспыленне свайго духу ў куртуазных забавах, а найперш – годнасць, людскасць, адданасць Бацькаўшчыне. Такія маральныя каштоўнасці, як шчырасць, спагадлівасць, былі арганічнымі для людзей, якія акружалі з дзяцінства будучага мастака. Вялікі ўплыў на фарміраванне асобы хлопчыка меў яго дзядзька Клеменс Гаснеўскі, які валодаў фальваркам Вацлавін у Свянцянскім павеце. Міхал тут быў частым госцем. Асабліва ўражвалі юную душу апавяданні пра гісторыю Вялікага Княства Літоўскага, партрэты каралёў Рэчы Паспалітай у пакоях дома. Скіраванасць дзядзькі на гісторыю і культуру Бацькаўшчыны вызначыла захапленне Андрыёлі пазнаваць родны край. Ён пачынае адкрываць для сябе Радзіму. Апантанае жаданне расказаць пра яе людзям мовай мастацтва падштурхоўвае да вучобы маляванню ў бацькі. Ужо ў юнацкім узросце ў Андрыёлі быў бачны талент мастака.

У развіцці мастацкіх здольнасцей і акрэсліванні жыццёвага шляху дапамагло знаёмства і сяброўства з Антоніем Залескім, які навучаўся маляванню ў школах Вены і Фларэнцыі. Асоба інтэлектуальная, з добрым веданнем гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, валоданнем некалькімі замежнымі мовамі ўзмацняла любоў Міхала да мастацтва і роднага краю.

У 1840–1850-х гг. Андрыёлі вучыўся ў Віленскай гімназіі. Тут ён пасябраваў з Людвікам Нарбутам, бацька якога, Тэадор Нарбут, захапляўся гісторыяй. Сам Людвік мроіў пра вызваленне Бацькаўшчыны ад імперскага ўціску. Лёс моцна звязаў гэтых апантаных і мужных асоб, наканаваўшы абодвум шлях барацьбы за свабоду Радзімы.

Бацька Міхала Андрыёлі не падзяляў захапленне сына маляваннем. Па яго загадзе юнак едзе паступаць на медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, дзе вучыўся яго старэйшы брат Эмпінія. Але адданасць мастацтву прыводзіць Міхала ў Маскоўскае вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства, дзе яго падтрымлівае зямляк, прафесар жывапісу, лепшы партрэтыст Расіі Сяргей Заранка. Акрылёны юнак малюе, пачынае атрымліваць ганарары ад продажу карцін, а ў 1857 г. за партрэт студэнта Імператарская акадэмія мастацтваў надае яму ганаровае званне мастака.

Жаданне тварыць, удасканальваць сваё майстэрства ў 1859 г. прыводзяць Андрыёлі ў Італію, у Акадэмію святога Лукі ў Рыме. Адбываецца знаёмства з радзімай бацькавых продкаў. Вучыцца не стае часу, аднак наладжваюцца стасункі з творчымі людзьмі: мастаком Віктарам Броўскім, рускім мастаком польскага паходжання Генрыхам Семірадскім і скульптарам Сянкевічам. Юнак заўзята вывучае краіну. З абозам Джузэпэ Гарыбальдзі ён ездзіць па Італіі, захапляецца яе цудоўнымі краявідамі. Менавіта іх прыгажосць абудзіла тугу па роднай Вільні, па роднай прыродзе. З Радзімы прыходзяць чуткі пра падрыхтоўку паўстання. Андрыёлі вяртаецца ў Вільню і апынаецца ў асяродку таленавітых, патрыятычна настроеных асоб: кампазітар Станіслаў Манюшка, мастак Адам Шэмеш, паэт Уладзіслаў Сыракомля, спявак і танцмайстар, фатограф Джузэпэ Ахілес Банольдзі. Эмпінія, брат Міхала, узначаліў Трокскі камітэт.

Калі пачалося паўстанне 1863 г., Андрыёлі арганізаваў атрад з 54 паўстанцаў. У бой пайшла моладзь, якой рухалі рамантычныя мары пра незалежнасць Радзімы. Потым лёс зноў зводзіць Міхала са славутым Людвікам Нарбутам, у атрадзе якога ён працягвае змагацца ў Лідскім павеце. Мастак удзельнічаў у некалькіх пераможных баях, маляваў паўсядзённыя клопаты паўстанцаў, рабіў баявыя замалёўкі.

Падчас бою Нарбут быў смяротна паранены. Андрыёлі ранілі ў руку. Атрад быў разбіты. Міхал знаходзіць прытулак у бацькоў Людвіка. Потым вяртаецца ў Вільню і, каб не нашкодзіць родным, бадзяецца па горадзе жабраком. Некаторыя з кіраўнікоў паўстання выехалі за мяжу. Пакідаць Радзіму Андрыёлі не хацеў. Ён звязваецца з падпольным кіраўніцтвам паўстання, атрымлівае мандат рэвалюцыйнага камісара Ковенскага павета, пашпарт на імя Маліноўскага і спрабуе агітаваць сялян, але дарэмна. Паўстанне было задушана.

Жыццё Андрыёлі напаўняецца такімі выпрабаваннямі, што пад сілу вытрымаць толькі вельмі мужнай асобе. Уцякаючы ад тэрору Мураўёва, Міхал апынуўся спачатку ў Маскве, потым Санкт-Пецярбургу, дзе быў выдадзены даносчыкам і пасаджаны на шэсць тыдняў у Петрапаўлаўскую крэпасць.

Дзеля высвятлення абставін высланы ў Коўна, дзе збягае з турмы. Начуючы ў стозе сена, абмарозіў ногі. Выратаваў і выхадзіў паўстанца селянін. І зноў уцёкі... Рыга, Англія – цэлая адысея або хаджэнне па пакутах.

Трохі акрыяў Міхал у Парыжы, куды прыбыў у чэрвені 1864 г. Тут сабраліся многія паўстанцы: Валерый Урублеўскі, Канстанцін Далеўскі, Ахілес Банольдзі і інш. Гэта надае сілы тварыць. Радавала яшчэ і тое, што парыжскі часопіс «Ілюстрацыён» змясціў некалькі яго гравюр. Неўзабаве з'явіўся цыкл карцін, прысвечаных паўстанню 1863 г.: «Выступленне паўстанцаў», «Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў», «Суд Мураўёва», «Магіла паўстанца» і інш.

Андрыёлі быў сведкам мужнасці Нарбута і яго апошніх хвілін. Трагізмам прасякнута гравюра «Смерць Людвіга Нарбута каля Дубічаў», дзе паказаны момант бойкі паўстанцкага атрада з ворагам. У цэнтры малюнка Андрыёлі змясціў невялікую групу людзей, якія выносяць параненага Нарбута з поля бою, сярод іх намаляваў і сябе. Гэта група высветлена, быццам пражэктарам, з цёмнай хаатычнай масы ваюючых. У паўстанцаў стомленыя разгубленыя твары. Мастак імкнецца праз драматызм сітуацыі паказаць недастатковую арганізаванасць і падрыхтоўку паўстання.

Паўстанцкі цыкл прынёс Андрыёлі вядомасць сярод эмігрантаў у Парыжы. На палотнах былі выяўлены рэальныя ўдзельнікі паўстання, а не ідэалізаваныя вобразы, што ўласціва было для работ тагачасных еўрапейскіх мастакоў. Андрыёлі здолеў аб'ектыўна адлюстраваць гераічна-трагічную падзею беларускай гісторыі, увекавечыць подзвіг змагароў.

Па просьбе Уладзіслава Міцкевіча ў Парыжы Андрыёлі робіць 22 ілюстрацыі да кнігі Генрыха Жавускага «Успаміны Сапліцы». Дасканалае веданне побыту, звычаяў, традыцый беларускай шляхты вызначае мастацкую каштоўнасць работ. У духу рамантызму яны прасякнуты ідэалізацыяй добрых шляхецкіх часоў.

Усё складвалася ў Міхала, але гераічная натура мастака штурхала да актыўных дзеянняў. Нягледзячы на небяспеку, Андрыёлі вяртаецца на радзіму як эмісар Камітэта польскай эміграцыі для аднаўлення разгромленай рэвалюцыйнай арганізацыі. Праз Швейцарыю, Германію, Аўстрыю і Балканы дабіраецца разам з Томашам Грэгутовічам да Стамбула. Пры пераходзе расійскай мяжы быў арыштаваны і пасаджаны за краты Хоцінскага замка. Не зламаўся, уцёк, вырашыў адпомсціць кантрабандысту, які выдаў. Падпаліў яго карчму і зноў быў схоплены. Навісла пагроза катаргі ў Сібір, але выйшаў царскі ўказ аб амністыі паўстанцам, і Міхала этапам адпраўляюць у Вільню для правядзення следства. Каб выратавацца, намаляваў партрэт жонкі губернатара – замест 15 гадоў катаргі быў сасланы ў Вятку.

Вяткаўскі перыяд жыцця і творчасці Міхала Андрыёлі быў неадназначны. Актыўная натура мастака прагнула дзейнасці. Не атрымалася спроба стварыць пры газеце «Вятские губернские ведомости» ілюстрацыйны дадатак, затое паспяхова зарабляе маляваннем партрэтаў, абразоў. Аптымізм мастака ўзнагароджваецца матэрыяльным прыбыткам. Шанцуе і на ніве сапраўднай

творчасці. У часопісе «Ілюстраваны штотыднёвік» Л. Яніка з'яўляюцца шэсць яго арыгінальных ілюстрацый да «Крымскіх санетаў» Адама Міцкевіча. Прыходзіць гучнае прызнанне таленту, адзначаецца своеасаблівасць стылю маладога мастака Міхала Андрыёлі. Праяўляюцца ў гэты час і педагагічныя здольнасці: дае ўрокі малявання юнаму Апалінарыю Васняцову, які пазней з удзячнасцю будзе ўспамінаць свайго настаўніка.

Скарыстаўшы амністыю для ссыльных, 25 жніўня 1871 г. Андрыёлі пакідае Вятку і вяртаецца на радзіму. Варшаўскі перыяд стаў найбольш плённым у творчым лёсе мастака. Гэтаму садзейнічала і акружэнне: сябры-паўстанцы, моладзь, якая захаплялася яго паўстанцкімі подзвігамі. Наступае перыяд апантанай працы па 12 гадзін у дзень. Толькі ў 1871–1880 гг. было намалявана больш за 300 палотнаў, паводле якіх былі зроблены гравюры. Яны друкаваліся ў часопісах «Ілюстраваны штотыднёвік», «Каласы», «Бяседа літаратурная». Бытавыя карціны Андрыёлі часта перарастаюць у батальны жанр, адпавядаюць духоўным, грамадскім запатрабаванням людзей таго часу. Сацыяльная заглыбленасць, вобразнасць і пачуццёвасць вызначаюць стыль мастака.

Талент Андрыёлі праявіўся найбольш поўна ў кніжнай графіцы. Змены ў грамадска-палітычным жыцці не маглі не паўплываць на тэматыку яго прац. Мастак адлюстроўваў падзеі 1863 г., ілюстраваў творы вядомых пісьменнікаў: «Марыя» Аляксандра Мальчэўскага, «Votum» Каятана Крашэўскага, «Дабрародны Ян Дубарог» Уладзіслава Сыракомлі, «Успаміны квестара» Ігната Ходзькі, «Мейр Езафовіч» Элізы Ажэшкі, «Кунігас» Ігната Крашэўскага і інш.

У сваёй творчасці Міхал Андрыёлі звяртаўся да падзей беларускага мінулага, да тых часоў, калі Вялікае Княства Літоўскае было магутным і незалежным. Тэме адстойвання свабоды прысвечаны такія гравюры, як «Бойка ліцвінаў з крыжакамі», «Смерць Кейстута», «Гусляр».

Кампазіцыя гравюры «Смерць Кейстута» вельмі напружаная і эмацыянальная. На ёй паказаны апошнія імгненні жыцця князя Вялікага Княства Літоўскага Кейстута. Па загадзе князя Ягайлы яго забіваюць здраднікі. Па кампазіцыі гравюры, размяшчэнні святла і ценяў чытаецца сімпатыя аўтара да персанажаў. Андрыёлі вылучае святлом постаць Кейстута, асвятляе яго валявы твар, рашуча сціснутыя кулакі. Фігуры ж забойцаў знаходзяцца ў цені, мастак акцэнтуе толькі іх зброю. У гравюры назіраецца трагедыйнае ўзвышэнне і сатырычнае зніжэнне.

Папулярнасць Андрыёлі як мастака прыносіць яму шмат заказаў. Працуецца з задавальненнем. У 1873 г. ён набывае сядзібу ў Брэгах каля Мінска-Мазавецкага, бярэ шлюб з Наталляй Таранеўскай. У рэчышчы асветніцкай парадыгмы імкнецца стварыць у сваёй сядзібе культурную ідылію. Сярод сяброў былі таленавітыя асобы: паэт Вінцэнт Каратынскі, этнограф Ян Карловіч, мастакі Уладзіслаў Дмахоўскі і Напалеон Орда, паэт Адам Плуг. Іх аб'ядноўвала любоў да Літвы (Беларусі).

Андрыёлі лічыўся лепшым рысавальшчыкам у Польшчы, таму львоўскі кнігавыдавец Герман Алтэнберг заказаў яму праілюстраваць славутую паэму

Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», якую мастак ведаў на памяць. З вялікім хваляваннем і адказнасцю ён прыступіў да працы, аднак натхнення не было. Памірае дачка. І ўсё ж гэты твор выйшаў у 1882 г. у лейпцыгскім выдавецтве Ф. Брахгаў за 25 ілюстрацыямі. Тагачасная крытыка не зразумела і не ацаніла значнасць дадзенай працы, не заўважыла, што Андрыёлі здолеў адлюстраваць эстэтызацыю гераічнага мінулага, якой прасякнуты твор Міцкевіча, і зразумець яе вялікую ролю ў фарміраванні патрыятызму, духоўнага імунітэту супраць спусташальнага бяспамяцтва роднай гісторыі і культуры. Нашчадкі ліцвінізму ў творах А. Міцкевіча і М. Андрыёлі паказаны як людзі высокай культуры, здольныя да гераічнага змагання. Мастак здолеў перадаць адметнасць беларускага хранатопу ў XIX ст., які вызначаецца суіснаваннем напружанай экспрэсіі бунтоўнага рамантызму і пастэльнай суцішанасцю бідэрмайера.

Талент Міхала Андрыёлі быў прызнаны далёка за межамі роднай зямлі. У 1883 г. мастака запрашаюць у Парыж ілюстраваць кнігі вядомых аўтараў: Гюго, Карнэля, Купера і Шэкспіра. За чатыры месяцы мастак стварае 150 малюнкаў да рамана Фенімора Купера «Апошні з магікан», працуе над ілюстрацыямі да «Конрада Валенрода», трагедыі Шэкспіра «Рамэо і Джульета». Работы Андрыёлі не страцілі сваей мастацкай значнасці па сённяшні дзень.

Сум па радзіме, сямейныя абставіны вымушаюць мастака вярнуцца дадому ў 1886 г. І зноў творчая праца, падарожжы па Літве (Беларусі). У гэты час з вялікім натхненнем стварае ілюстрацыю да «Пана Тадэвуша» «Канцэрт над канцэртамі», якую заказаў яму граф Бенедыкт Тышкевіч. Работу публіка ўбачыла на прыватнай выставе ў Варшаве ў канцы сакавіка 1888 г. Быў вялікі поспех, які натхніў Андрыёлі на апантанную працу. З вялікім натхненнем ён стварае партрэты Міцкевіча, Касцюшкі, Крашэўскага. З аднолькавым поспехам мастак працаваў у бытавым, партрэтным, батальным, пейзажным, гістарычным жанрах, што сведчыць пра вялікі талент.

Аднак па-ранейшаму цягне Андрыёлі ў падарожжы. У лютым 1893 г. ён выехаў на Балканы і некалькі месяцаў вандраваў па Далмацыі, Харватыі і Чарнагорыі і працаваў. Нататкі пра ўбачанае і перажытае дасылаў ў часопісы «Варшаўскі кур'ер» і «Слова», «Ілюстраваны штотыднёвік» (змясціў новы малюнак «Уваскрашэнне Хрыста»). Аднак хвароба вымусіла мастака вярнуцца ў Варшаву. 23 жніўня 1893 г. Міхал Эльвіра Андрыёлі памірае.

У беларускай культуры асоба Міхала Андрыёлі асацыіруецца з нацыянальным адраджэннем, якое складвалася падобна італьянскаму – ва ўмовах існавання нацыі на мяжы знікнення. Становішча беларусаў супаставіў са становішчам італьянцаў М. Дабралюбаў у 1860 г.: «Гэта гэтак жа, як італьянцаў, забілі, расслабілі, пазбавілі любві да радзімы і свабоды!.. А паглядзіце цяпер на іх... Ва ўсякім выпадку пытанне пра характар беларусаў павінна быць хутка растлумачана працамі мясцовых пісьменнікаў. Паглядзім, што яшчэ скажуць самі беларусы» [1, с. 93].

Нацыянальнае адраджэнне сфарміравала ідэю і духоўнае аблічча культурнага героя праметэеўскага тыпу і лёсу на аснове міфалагічна-рэлігійнага і сацыяльнага вопыту спасціжэння гісторыі. Героі паўстання 1863 года былі рэальным увасабленнем беларускай ідэі, крэаторамі соцыуму. Творчасць Міхала Андрыёлі праўдзіва адлюстравала гераічную гісторыю беларускай зямлі, унесла вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай школы гравюры.

**Літаратура**

1. Добролюбов, Н. А. Собр. соч.: в 3 т. / Н. А. Добролюбов; сост. Ю. Г. Буртина. – М.: Худ. лит., 1986. – Т. 3.: Статьи и рецензии, 1860–1861. – 871 с.

**Г. А. Флікоп-Світа** *(Мінск, Беларусь)*

## «МАДОННА Ў КРЭСЛЕ» РАФАЭЛЯ І АБРАЗЫ XIX ст. З БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАГА ПАМЕЖЖА: ІКАНАГРАФІЧНАЯ ЎЗАЕМАСУВЯЗЬ І ШЛЯХІ ПЕРАЙМАННЯ

Уплыў італьянскага жывапісу на выяўленчае мастацтва іншых краін на працягу ранейшых стагоддзяў з'яўляецца відавочным і даволі добра даследаваным. Эпоха Рэнесансу стала знакавым новым этапам у еўрапейскай культуры, а італьянскае мастацтва ў гэты час узнеслася на новы ўзровень і выступіла ўзорам і арыенцірам для розных відаў творчай дзейнасці ў краінах свету. Іншаземныя майстры з руплівасцю працавалі над перайманнем італьянскіх кампазіцый і запазычвалі адтуль нават дробныя дэталі, уносячы пры гэтым у свае творы мясцовы каларыт.

Такія з'явы былі ўласцівы і беларускаму мастацтву, прычым у розныя яго перыяды. У дадзеным артыкуле мы абмяжуемся аналізам невялікай групы помнікаў, аб'яднаных агульным сюжэтам. Гэтыя творы ў цяперашні час захоўваюцца пераважна ў музеях краіны і некаторых прыватных калекцыях. Іх агляд ужо сам па сабе будзе мець пэўную каштоўнасць, бо большасць прадстаўленых у артыкуле абразоў дагэтуль не ўведзены ў навуковае карыстанне. На канкрэтных прыкладах будзе паказана, якім чынам здабыткі італьянскага жывапісу засвойваліся на нашых тэрыторыях, а таксама будуць выяўлены тыя шляхі, якімі кампазіцыі з Італіі дасягалі беларускіх зямель у XIX – пачатку XX ст.

Пры вывучэнні абразоў у фондах айчынных музеяў нашу ўвагу прывабіў адзін сюжэт, які знайшоў увасабленне ў шэрагу твораў Беларусі і яе ўсходняга памежжа ў XIX ст. Гаворка ідзе пра карціну Рафаэля «Мадонна ў крэсле» (1513–1514 гг.) [21, с. 26] (мал. 1), якой (і копіям з якой) і прысвечаны дадзены артыкул. Твор напісаны на палатне алейнымі фарбамі. Кампазіцыя абраза